ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 1 (596) | Субота, 5 студзеня 1985 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*НАСУСТРАЧ ВЫБАРАМ*

## ДЗЕЙНІЧАЕ АГІТЦЭНТР

24-га лютага бягучага года адбудуцца выбары ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя органы Савецкай улады. Іх правядзенне сёлета мае выключнае значэнне. Выбары будуць праходзіць у завяршальны год адзінаццатай пяцігодкі, у перыяд актыўнай падрыхтоўкі да XXVII з'езда КПСС і святкавання 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У гэтай сувязі на партыйную арганізацыю, увесь калектыў універсітэта ўскладаюцца вялікія задачы па арганізацыйнаму і агітацыйна-прапагандысцкаму забеспячэнню ўсёй выбарчай кампаніі.

Як і да папярэдніх выбараў, у ГДУ створаны агітцэнтр. Тут каардынуецца ўся работа агіткалектываў. Агітцэнтр праводзіць для выбаршчыкаў цыклы лекцый: «Актуальныя пытанні ідэалагічнай барацьбы на сучасным этапе», «Канстытуцыя СССР — Асноўны закон развітога сацыялізму», «БССР у саюзе брацкіх рэспублік», «40-годдзе Перамогі і ідэалагічная барацьба». Арганізуюцца таксама сустрэчы выбаршчыкаў з інфармацыйна-прапагандысцкай групай Цэнтральнага райкома партыі г. Гомеля, выступленні агітбрыгады ГДУ, кансультацыі юрыстаў і педагогаў.

Вялікая роля ў агітацыйна-масавай рабоце належыць агіткалектывам. Састаў агітатараў зацверджаны на пасяджэннях партбюро факультэтаў. Кіраўнікі агіткалектываў зацверджаны партыйным камітэтам ГДУ. У агіткалектывы падабраны найбольш падрыхтаваныя камуністы, камсамольцы і беспартыйныя актывісты. Кіраўнікі агіткалектываў У. І. Коваль, В. П. Крукоўскі і іншыя выкладчыкі універсітэта маюць значны вопыт работы. Яны здольны забяспечыць высокі ўзровень усіх масава-палітычных мерапрыемстваў. Цыклы лекцый і гутарак, грамадска-палітычныя чытанні, тэматычныя вечары, выступленні агітбрыгад, сустрэчы з ветэранамі партыі, вайны і працы пройдуць ва ўмовах высокай адказнасці агітатараў да сваіх абавязкаў. З усёй сур'ёзнасцю яны аднясуцца і да складання спіскаў выбаршчыкаў. У адпаведнасці з палажэннем аб выбарах яны будуць гатовы за 20 дзён да дня галасавання.

Цяпер наступіў адзін з самых адказных этапаў выбарчай кампаніі — вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты. Можна з цвёрдай упэўненасцю сказаць, што ён пройдзе ў абстаноўцы высокай палітычнай актыўнасці ўсіх выбаршчыкаў.

**В. МАСЛЮКОЎ,**
**загадчык агітцэнтра.**

*У парткоме*

## МАЦАВАЦЬ ДЫСЦЫПЛІНУ

На апошнім у мінулым годзе пасяджэнні парткома абмеркавана пытанне аб рабоце рэктарата і прафкома па ўмацаванню працоўнай, вучэбнай і выканаўчай дысцыпліны. Заслуханы паведамленні прарэктара па завочнаму навучанню Л. Н. Сечкі і старшыні прафкома М. Н. Мурашкі. Аб выніках праведзенай праверкі з інфармацыяй выступілі намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце Г. Д. Ветлугаеў і В. І. Сіськоў. Па абмяркоўваемаму пытанню выступілі таксама прарэктар па вучэбнай рабоце Л. А. Шамяткоў, дацэнт кафедры гісторыі КПСС Я. А. Семянчук, сакратар парткома М. І. Старавойтаў, рэктар універсітэта Б. В. Бокуць і іншыя члены парткома. На пасяджэнні парткома адзначалася, што за апошні час ва універсітэце праведзена значная работа па ўмацаванню дысцыпліны ва ўсіх структурных падраздзяленнях ГДУ. Разам з тым указвалася і на істотныя недахопы. Пытанні працоўнай, вучэбнай і выканаўчай дысцыпліны яшчэ не сталі ў цэнтры ўвагі прафсаюзных бюро, таварыскага суда, загадчыкаў кафедр, кіраўнікоў іншых універсітэцкіх падраздзяленняў. Слаба вядзецца барацьба з пропускамі студэнтамі заняткаў без уважлівых прычын.

На пасяджэнні парткома прынята пастанова, у якой прадугледжаны меры па далейшаму ўмацаванню працоўнай, вучэбнай і выканаўчай дысцыпліны.

*Мы — інтэрнацыяналісты*

## АБ БРАТНЯЙ КРАІНЕ

Шмат цікавага аб братняй Чэхаславакіі даведаліся члены КІДа «Саюз» ГДУ ў час прэс-канферэнцыі з байцамі інтэрнацыянальнага атрада «Дружба-84». Мінулае лета студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта універсітэта, якія з'яўляліся членамі інтэратрада, правялі ў Паўднёва-Чэшскай вобласці. Горад-пабрацім Чэске-Будзеёвіцы кожны год прымае гомельскіх студэнтаў, якія разам з чэшскімі сябрамі з Вышэйшай сельскагаспадарчай школы працуюць поплеч на будаўнічых аб'ектах.

Рабяты прывезлі шмат цікавых матэрыялаў аб ЧССР — фатаграфіі, паштоўкі, кнігі, слайды. З імі яны пазнаёмілі членаў КІДа. Асабліва запомніўся ім расказ байца атрада Таццяны Рабенка аб Пражскім градзе. Аб ударнай працы на будаўніцтве жылога дома і жывёлагадоўчага комплексу ў мястэчках Жар і Горная Стропніца гаварылі ў час прэс-канферэнцыі Міхаіл Бацеха і Анатоль Шумілаў.

Па традыцыі пасля канферэнцыі адбылося чаепіцце, у час якога праводзіліся вясёлыя конкурсы, віктарыны. Гучалі песні пад акампанемент гітары ў выкананні прэзідэнта КІДа Ірыны Даўгун, іншых удзельнікаў сустрэчы.

**Э. САВЯНОК,**
**студэнтка групы М-24 матэматычнага факультэта, член КІДа «Саюз».**

## АТРАДЫ-ПЕРАМОЖЦЫ ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА—84

**СЯРОД АТРАДАЎ БУДАЎНІЧАГА НАПРАМКУ:**

1-е месца — СБА **«Волаты»** фізічнага факультэта (камандзір **І. Новік**, камісар **А. Сялеця**).

2-е месца — СБА **«Арыён»** матэматычнага факультэта (камандзір **М. Марчанка**, камісар **У. Баброў**).

3-е месца — СБА **«Памяць»** біялагічнага факультэта (камандзір — **У. Ранько**, камісар **Г. Коваль**).

**СЯРОД АТРАДАЎ НЕБУДАЎНІЧАГА НАПРАМКУ:**

1-е месца — **атрад імя М. Мароза** біялагічнага факультэта (камандзір **Т. Шапавалава**, камісар **Г. Лаўчак**).

2-е месца — атрад **«Грэнада»** эканамічнага факультэта (камандзір **Л. Прусава**, камісар **А. Міранец**).

3-е месца — атрад **«Мерыдыян»** матэматычнага факультэта (камандзір **В. Некрашэвіч**, камісар **А. Жосткіна**).



**Упэўненым крокам да будучай прафесіі настаўніка стала для пяцікурснікаў універсітэта перaддыпломная педагагічная практыка. Надоўга запамятаецца яна і студэнтцы групы М-52 матэматычнага факультэта Галіне Ліневіч, якая вяла ўрокі матэматыкі ў прафтэхвучылішчы № 126 г. Гомеля.**

**НА ЗДЫМКУ: Г. Ліневіч у час урока.**

**Фота А. Рудчанкі.**

## СТВОРАНА НОВАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ

Нядаўна на біястанцыі «Старыя Чонкі» адбылася знамянальная падзея. Старшы прэпаратар біястанцыі І. С. Храмчанкоў паспяхова правёў аналіз на ўтрыманне бялку ў новым сорце лубіну белага.

Гэта паклала пачатак рабоце біяхімічнай лабараторыі, якая будзе весці даследаванні не толькі па бялку, а таксама па тлушчу, алкалоідах, вугляводах і іншых кампанентах. Стварэнне такой лабараторыі было ўключана ў план мерапрыемстваў біялагічнага факультэта па выкананню рашэнняў майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС і Харчовай праграмы.

Новае навуковае падраздзяленне дазволіць узняць на якасна вышэйшы ўзровень даследаванні селекцыйна-генетычнага плана, а таксама даследаванні, якія праводзяць студэнты для выканання курсавых і дыпломных работ.

З мэтай паспяховай работы новай лабараторыі сабрана бібліятэка неабходнай навукова-метадычнай і спецыяльнай літаратуры. Тут жа ёсць патрэбныя пасуда і прыборы.

**М. БАЙДА,**
**загадчык біястанцыі «Старыя Чонкі».**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў фізічнага факультэта**

# ПРАЦОЎНАМУ СЕМЕСТРУ — АКТЫЎНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ І АРГАНІЗАВАНАСЦЬ

Праца студэнтаў у летні перыяд з'яўляецца працягам вучэбна-выхаваўчага працэсу ў ВНУ. Студэнцкія атрады, якія арганізоўваюцца на прынцыпах добраахвотнасці, самакіравання і строгай дысцыпліны, выхоўваюць у студэнтаў пачуццё адказнасці за работу ў калектыве, вучаць падыходзіць да справы з дзяржаўных пазіцый.

Сацыялістычнае спаборніцтва паміж лінейнымі студэнцкімі атрадамі універсітэта нацэльвае на паспяховае ажыццяўленне рашэнняў XXVI з'езда КПСС, XIX з'езда ВЛКСМ, на дастойную сустрэчу 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

## І. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ СПАБОРНІЦТВА

Сацыялістычнае спаборніцтва — важнейшы стымул вытворчай і вучэбнай дзейнасці студэнтаў. Мэта яго — павышаць якасць вучобы, грамадска-палітычную і працоўную актыўнасць юнакоў і дзяўчат.

**Задачы:**

— павышаць якасць вучобы студэнтаў, развіваць творчы падыход студэнтаў да вывучэння ўсіх дысцыплін;

— прыцягваць усіх студэнтаў да актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці універсітэта;

— выхоўваць моладзь на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа;

— ствараць у атрадзе дзелавую, творчую атмасферу ўзаемадапамогі, камсамольскай дысцыпліны і прынцыповасці;

— якасна фарміраваць студэнцкія атрады і праводзіць на высокім ідэйна-палітычным узроўні трэці працоўны семестр.

## ІІ. ФОРМА ПРАВЯДЗЕННЯ І АРГАНІЗАЦЫІ СПАБОРНІЦТВА

Сацыялістычнае спаборніцтва праводзіцца ў аглядзе-конкурсе на лепшую камсамольскую арганізацыю універсітэта і лепшы лінейны атрад па рабоце ў падрыхтоўчы і рабочы перыяд. Спаборніцтва праводзіцца паміж факультэтамі на званне «Лепшая камсамольская арганізацыя па падрыхтоўцы да працоўнага семестра», а таксама паміж лінейнымі атрадамі на званне «Лепшы студэнцкі атрад».

## ІІІ. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ КАМСАМОЛЬСКІМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ ФАКУЛЬТЭТАЎ НА ЗВАННЕ «ЛЕПШАЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ І ПРАВЯДЗЕННЮ ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА»

Падвядзенне вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва праводзіцца на факультэтах. Лепшай лічыцца камсамольская арганізацыя факультэта, якая набярэ большую колькасць балаў, не будзе мець выпадкаў парушэння Статута ВЛКСМ і правілаў тэхнікі бяспекі, а таксама праявіць высокую дысцыпліну і творчую ініцыятыву.

Вынікі падводзяцца ў два этапы: першы — падрыхтоўчы перыяд, другі — рабочы перыяд.

Па выніках падрыхтоўчага перыяду лепшая камсамольская арганізацыя ўзнагароджваецца Ганаровай граматай камітэта камсамола ГДУ.

Вынікі першага этапа падводзяцца ў маі 1985 года. Па выніках працоўнага семестра (падрыхтоўчы і рабочы перыяд) лепшай камсамольскай арганізацыі ўручаецца пераходны Чырвоны сцяг універсітэта, яна ўзнагароджваецца Ганаровай граматай рэктарата, парткома, камітэта ЛКСМБ і прафкома студэнтаў.

Вынікі другога этапа падводзяцца ў кастрычніку 1985 года.

## ЯКАСНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ ПАДРЫХТОЎЧАГА ПЕРЫЯДУ

**Арганізацыйная работа**

1.1. Працэнт студэнтаў, якія прымаюць удзел у студэнцкіх атрадах, ад агульнай колькасці студэнтаў.

1.2. Працэнт байцоў, якія маюць спецыяльнасць будаўнікоў.

1.3. Сярэдні бал экзаменацыйных адзнак па курсу «Ахова працы ў студэнцкіх будаўнічых атрадах».

1.4. Выкананне графікаў дагаворнай кампаніі, праходжэння медыцынскага агляду, навучанне па курсу «Ахова працы СБА», падача дакументацыі ў штаб працоўных спраў і г. д.

1.5. Сярэдні бал экзаменацыйных адзнак, атрыманых камандзірамі і камісарамі пры атэстацыі.

### ІДЭЙНА-ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА

2.1. Працэнт грамадска-палітычнага актыву студэнцкіх атрадаў, які прайшоў навучанне, ад агульнай колькасці байцоў.

2.2. Сярэдні працэнт выканання атрадамі сацыялістычных абавязацельстваў за падрыхтоўчы перыяд па грамадска-палітычнай рабоце.

2.3. Сума месцаў, занятых у аглядах-конкурсах, якія будуць праводзіцца штабам працоўных спраў універсітэта.

2.4. Прымяненне новых форм работы.

### РАБОЧЫ ПЕРЫЯД

1. Працэнт прыцягнення студэнтаў у СБА (адносіны ўсёй колькасці студэнтаў, якія прымаюць удзел у працоўным семестры, да агульнай колькасці студэнтаў, не ўлічваючы выпускнікоў — %.

II. Вытворчыя паказчыкі:

1. Сярэдняя выпрацоўка на аднаго члена атрада — руб.

2. Сярэднедзённая заработная плата на аднаго члена атрада (у студэнтаў-будаўнікоў) — руб.

3. Сярэднедзённая заработная плата на аднаго члена атрада (у студэнтаў небудаўнічых спецыяльнасцей) — руб.

4. Рацыяналізатарская работа:

а) колькасць пададзеных рацпрапаноў — адзінак;

б) эканамічны эфект ад іх укаранення — тыс. руб.

5. Паказчык адносін колькасці атрадаў, якія працуюць па метаду брыгаднага падраду, да агульнай колькасці студэнцкіх будаўнічых атрадаў — %.

6. Паказчык адносін колькасці аб'ектаў, здадзеных у эксплуатацыю або пад мантаж тэхналагічнага абсталявання, да агульнай колькасці аб'ектаў, прынятых да будаўніцтва — %.

III. Укараненне новых форм работы.

1. Колькасць навукова-даследчых атрадаў — чал.

2. Колькасць атрадаў жывёлаводаў — чал.

3. Колькасць атрадаў механізатараў — чал.

4. Колькасць студэнцкіх аграпрамысловых комплексаў — шт.

5. Колькасць інтэрнацыянальных атрадаў — шт.

6. Колькасць атрадаў бязвыплатнай працы — шт.

7. Колькасць студэнцкіх вытворчых атрадаў — шт.

IV. Узровень арганізацыі Дзён ударнай працы і ў фонд ганаровага байца — %.

V. Узровень арганізацыі грамадска-палітычнай работы:

1. Агітацыйна-прапагандысцкая работа:

— прачытана лекцый (на адзін атрад) — шт.

— дадзена канцэртаў (на адзін атрад) — шт.

2. Выкананне ўдарных спраў:

а) дапамога сельскай школе (на атрад);

— адрамантавана школ, дзіцячых садоў, іншых дзіцячых устаноў — шт.;

— абсталявана спецкабінетаў, фоталабараторый — шт.

— перададзена кніг — шт.;

— арганізавана кансультацыйных пунктаў — шт.;

— аформлена клубаў, бібліятэк — шт.;

— узведзена спортзбудаванняў — шт.;

— у піянерскім лагеры адпачыла дзяцей — чал.;

— працэнт выканання планавага задання па залічэнню ў атрады падлеткаў, якія стаяць на ўліку ў аддзеле ўнутраных спраў — %.

б) ваенна - патрыятычная работа (на атрад);

— аказана дапамога ветэранам вайны і працы — чал.;

— пабудавана і адрамантавана помнікаў, абеліскаў, устаноўлена мемарыяльных дошак — шт.;

— устаноўлены імёны невядомых герояў — чал.;

— створана «Куткоў славы» і працоўных летапісаў — шт.;

— пабудавана (адрамантавана) ціраў — шт.;

— пабудавана (адрамантавана) плавальных басейнаў — шт.;

в) дапамога калгасам, саўгасам у нарыхтоўцы кармоў (на атрад);

— нарыхтавана тон кармоў для грамадскай жывёлагадоўлі — т.;

— аформлена «чырвоных куткоў» на жывёлагадоўчых фермах — шт.;

— перапрацавана тон зерня — т.;

г) вынікі агульнауніверсітэцкага «Тыдня студэнцкіх атрадаў»;

— месца, занятае ў агульнауніверсітэцкім аглядзе-конкурсе агітбрыгад;

— месца, занятае ў агульнауніверсітэцкім аглядзе-конкурсе лектараў;

— месца, занятае ў агульнауніверсітэцкім аглядзе-конкурсе на лепшае веданне гісторыі і традыцый СБА;

— месца, занятае ў аглядзе-конкурсе на лепшае мастацка-палітычнае афармленне студэнцкіх лагераў.

VI. Узровень арганізацыі ўнутрыатраднага жыцця байцоў СБА і захавання Статута УСБА:

— працэнт кіраўнікоў атрада, якія панеслі спагнанні — %;

— стан фінансава-гаспадарчай дысцыпліны ў СБА.

VII. Узровень медыка-санітарнага забеспячэння:

— сабрана лекавых раслін на аднаго чалавека — кг.

## IV. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА СЯРОД СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ НА ЗВАННЕ «ЛЕПШЫ СТУДЭНЦКІ АТРАД»

Лепшым студэнцкім атрадам універсітэта лічыцца атрад, які мае найвышэйшы працэнт выканання сацыялістычных абавязацельстваў у падрыхтоўчым і рабочым перыядзе, які паказаў высокую дысцыпліну і творчую ініцыятыву, які не мае парушэння Статута УСБА і правілаў тэхнікі бяспекі.

Вынікі падводзяцца ў два этапы: першы — падрыхтоўчы перыяд, другі — рабочы перыяд.

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва лепшыя студэнцкія атрады ГДУ, якія зоймуць 1, 2, 3 месцы, узнагароджваюцца Ганаровымі граматамі камітэта ЛКСМБ ГДУ. Вынікі першага этапа падводзяцца ў маі 1985 года.

Па выніках працоўнага семестра (падрыхтоўчы і рабочы перыяд) тры лепшыя студэнцкія атрады ГДУ па напрамках работы (будаўнічага і небудаўнічага профілю) узнагароджваюцца Ганаровай граматай камітэта камсамола ГДУ. Фатаграфіі атрадаў каля Сцяга універсітэта змяшчаюцца ў альбом працоўнай славы камітэта камсамола ГДУ.

Вынікі сацыялістычнага спаборніцтва падводзяцца штабам працоўных спраў і зацвярджаюцца камітэтам камсамола універсітэта.

**КАМІТЭТ ЛКСМБ, ШТАБ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ ГДУ.**

# САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

## ЗВОДНАГА СТУДЭНЦКАГА АТРАДА ГДУ НА ПАДРЫХТОЎЧЫ ПЕРЫЯД

**У выкананні рашэнняў XXVI з'езда КПСС актыўны ўдзел прымае студэнцкая моладзь Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Ударнай працай, высокай грамадска-палітычнай актыўнасцю азнаменаваў зводны студэнцкі атрад ГДУ працоўны семестр-84. Больш 1000 камсамольцаў у розных галінах народнай гаспадаркі вобласці і за яе межамі выканалі аб'ём работ на суму 1 мільён 38 рублёў, правялі на месцах дыслакацыі вялікую агітацыйна-прапагандысцкую работу.**

**Кіруючыся рашэннямі XXVI з'езда КПСС, майскага (1982 г.), красавіцкага (1984 г.), лістападаўскага (1984 г.) Пленумаў ЦК КПСС, XIX з'езда ВЛКСМ, актыўна ўключыўшыся ў патрыятычны рух камсамольцаў і моладзі «XI пяцігодцы — ўдарную працу, веды, ініцыятыву і творчасць маладых!», удзельнікі трэцяга працоўнага семестра 1985 года бяруць наступныя сацыялістычныя абавязацельствы:**

**— Сацыялістычнае спаборніцтва ў трэцім працоўным семестры 1985 года правесці пад дэвізам: «40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне — дастойную сустрэчу!»**

**— Сфарміраваць зводны студэнцкі атрад ГДУ ў колькасці 1000 чалавек.**

**— Падрыхтаваць па 3—5 лектараў для кожнага атрада. Прарэцэнзіраваць 100 прац. тэкстаў лекцый.**

**— Падрыхтаваць па 48 дружын па ахове прыроды, дружыннікаў-выратавальнікаў, адказных за кансультацыйны пункт, ваенна-патрыятычную, спартыўную работу, за работу па аказанню дапамогі сельскай школе, рэдактараў насценных газет, кіраўнікоў агітбрыгад, старшынь рэвізійных камісій.**

**— Якасна правесці вучобу па тэхніцы бяспекі. Дабіцца 75 прац. адзнак «выдатна», 25 прац. — «добра».**

**— Прарэцэнзіраваць 100 прац. сцэнарыяў агітбрыгад. Палепшыць іх змест і тэматычную накіраванасць.**

**— Прыняць удзел у абласным «Тыдні студэнцкіх атрадаў» і заняць адно з прызавых месц.**

**— Якасна правесці вучобу кіраўнікоў атрадаў і ўсяго актыву СБА.**

**— Абучыць 75 прац. членаў студэнцкіх атрадаў будаўнічым спецыяльнасцям.**

**— Своечасова і якасна правесці дагаворную кампанію.**

**— Своечасова і арганізавана правесці медыцынскі агляд удзельнікаў працоўнага семестра.**

**— Аформіць на кожным факультэце стэнд, прысвечаны дзейнасці СБА.**

**— Рэгулярна змяшчаць матэрыялы ў газеце «Гомельскі універсітэт» аб фарміраванні і падрыхтоўцы студэнцкіх атрадаў да працоўнага семестра.**

**— Выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва па лепшаму правядзенню працоўнага семестра-85 камсамольскую арганізацыю Гомельскага політэхнічнага інстытута.**

